**23.** Якія з дадзеных слоў у рускай і беларускай мовах адрозніваюцца месцам пастаноўкі націску?

*1) крапіва; 2) вярба; 3) караван; 4) квартал.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**24.** Адгадайце загадку, правільна склаўшы “рассыпаныя” літары.

*Сярод поля іскаркі блішчаць.*

**А)** і, о, к, з, р. **Б)** ы, у, б, з. **В)** е, н, е, з, р. **Г)** а, ж, т, ы. **Д)** ё, с, в, а.

**25.** Высушаныя з костачкамі дробныя плады абрыкосаў называюцца … .

**А)** сліва. **Б)** разынкі. **В)** боб. **Г)** алыча. **Д)** урук.

**26.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару *ў*?

*1) а..ра; 2) фа..на; 3) со..с; 4) а..л.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**27.** У розных мясцовасцях Беларусі можна пачуць словы *вытанкі, скакушкі, выдрыганцы, брандушкі*. Аказваецца, яны з’яўляюцца сінонімамі назвы жанру вуснай народнай творчасці … .

**А)** прыказкі. **Б)** прымаўкі. **В)** загадкі.
**Г)** прыпеўкі. **Д)** крылатыя словы.

**28.** Янка атрымаў заданне скласці са слоў, дадзеных на картках, народнае выслоўе. Дапамажыце хлопчыку справіцца з заданнем.

*1) не дачакаешся; 2) і; 3) лянівага; 4) санлівага;*
*5) не дашлешся; 6) не дабудзішся.*

**А)** 1, 3, 4, 5, 2, 6. **Б)** 2, 4, 5, 3, 6, 1. **В)** 3, 1, 2, 4, 6, 5.
**Г)** 4, 6, 3, 5, 2, 1. **Д)** 5, 3, 2, 1, 4, 6.

**29.** Колькі ўсяго зацвярдзелых зычных у народным выслоўі:

*Што напісана пяром, не вычашаш і тапаром?*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**30.** Хто з беларускіх мастакоў слова ў свой час напісаў у прадмове да зборніка “Мая дудка”: “*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі*”?

**А)** Цётка. **Б)** Янка Лучына. **В)** В. Дунін-Марцынкевіч.
**Г)** Францішак Багушэвіч. **Д)** Янка Купала.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 36100 экз. г. Мінск. 2017 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2017»

*Чацвер, 16 лютага 2017 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Жыхары даюць свае адметныя назвы тым месцам, дзе жывуць. Напрыклад, Лондан называюць горадам дажджоў, Чыкага – горадам вятроў, Венецыю – горадам каналаў. А як называюць Салігорск?

**А)** горадам мар. **Б)** горадам усмешак. **В)** горадам солі.
**Г)** горадам дасціпнасці. **Д)** горадам гор.

**2.** Колькі ўсяго назоўнікаў ужыў М. Маляўка ў скорагаворцы?

*Рак* *І блішчыць ад лаку*
*Улез у лак –* *Рак.*

**А)** няма назоўнікаў. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**3.** Падбярыце сінонімы да прыметнікаў у словазлучэннях:

*1) слабы вецер;* *а) хваравітае(-ы);*
*2) слабы характар;* *б) нямоцнае(-ы);*
*3) слабае здароўе;* *в) лёгкі(-ае);*
*4) слабае дзіця.* *г) нерашучы(-ае);*
*д) моцны(-ае).*

**А)** 1-а, 2-д, 3-в, 4-б. **Б)** 1-б, 2-в, 3-а, 4-г. **В)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-д. **Д)** 1-д, 2-а, 3-г, 4-в.

**4.** Якім словам з дадзеных можна выказаць сэнс устойлівага спалучэння *на скорую руку*?

*1) падманваць; 2) паспешліва; 3) пакрыўдзіцца; 4) моцна.*

**А)** няма патрэбнага слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**5.** У якім(-іх) слове(-ах) напішаце адну зычную літару?

*1) ма(с, сс)а; 2) гру(п, пп)а; 3) кла(с, сс); 4) то(н,нн)а.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 4. **В)** 1, 2. **Г)** 3. **Д)** 2, 4.

**6.** Адпаведнік рускага слова *благоразумие* ў беларускай мове … .

**А)** дабрадзейства. **Б)** дабро. **В)** знаходлівасць.
**Г)** разважлівасць. **Д)** настойлівасць.

**7.** Дадзены словы: *1) быццам; 2) яды; 3) пасля; 4) касы; 5) расы; 6) роўна; 7) пракоса.* Выкарыстаўшы патрэбныя словы, складзіце народнае параўнанне.

**А)** 1, 6, 2, 5. **Б)** 3, 2, 6, 7. **В)** 5, 1, 3, 4. **Г)** 6, 1, 3, 5. **Д)** 6, 1, 3, 4.

**8.** Колькі ўсяго [о] у вершаваных радках П. Броўкі?

*Заўсёды з любай кніжкай быў,*
*І быццам аж мільёны жыццяў*
*Я за адно сваё пражыў.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**9.** Колькі  лічбаў ад 1 да 10 пры вымаўленні маюць [с']?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**10.** Падлічыце, колькі двухскладовых слоў у вершаваных радках Р. Барадуліна.

*А над елкай* *Пільнавалі шлях далёкі,*
*Дзве сарокі* *Ці яшчэ гняздо чыё.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**11.** Якое слова "заблудзілася" ў радзе?

*Морква, радыска, вішня, гарбуз, агурок.*

**А)** морква. **Б)** радыска. **В)** вішня. **Г)** гарбуз. **Д)** агурок.

**12.** Вызначце словы, якія правільна падзелены для пераносу.

*1) аб-но-ўка; 2) смя-тан-ка; 3) пад'-ём-нік; 4) ма-дэл-ьер.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**13.** У якіх словах літара *ц* абазначае [ц']?

*1) суніцы; 2) цяля; 3) цярпенне; 4) цукеркі.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**14.** Вызначце з дадзеных простыя сказы.

*1) Белы туман паступова развеяўся, і ўсё навокал пасвятлела, праяснілася.*
*2) На зялёную траву, упрыгожаную познімі кветкамі, прызямліўся шэры журавель з пышным султанам чорнага хваста.*
*3) Рухі ў яго былі лёгкія і грацыёзныя, нібы ў элегантнага танцора.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**15.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце літару *я*?

*1) зав..зь; 2) дроб..зь; 3) к..раміка; 4) л..генда.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** У якіх словах націск служыць для адрознення лексічнага значэння?

*1) замкі; 2) хвалі; 3) насып; 4) дзікі.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** Выберыце словы, у якіх правільна пастаўлены націск.

*1) спіна́; 2) пурпу́р; 3) шкляны́; 4) ката́лог.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**18.** Вучні запісвалі беларускія адпаведнікі рускім словам.

Міхась запісаў *тыква – гарбуз.* Юрась запісаў *утюг – уцюг.*
Антось запісаў *потолок – столь.*
Хто з вучняў правільна выканаў заданне?

**А)** усе вучні. **Б)** ніхто з вучняў. **В)** Міхась і Юрась.
**Г)** Міхась і Антось. **Д)** Юрась і Антось.

**19.** Якія назоўнікі з дадзеных правільна напісаны?

*1) у лагеры; 2) на кастрэ; 3) на лузе; 4) на рацы; 5) аб юнаке.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**20.** Дадзены словы: *1) апладзісменты; 2) цьвіцці; 3) гвардзеяц; 4) цацверг.* Якія словы напісаны няправільна?

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** толькі 4. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.

**21.** Транскрыпцыя якіх слоў з дадзеных зроблена правільна?

1) [яблык]; 2) [шамп'ін'йон]; 3) [с'м'элас'ц']; 4) [л'іп'энь].

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**22.** Якое лексічнае значэнне мае ўстойлівае спалучэнне *за гуж узяцца*?

**А)** 'трапіць у цяжкае становішча'.
**Б)** 'распачаць якую-небудзь справу, лічачы сябе здольным выканаць яе'.
**В)** 'аддаленая будучыня, нешта няпэўнае'.
**Г)** 'каб стварыць падманлівае ўражанне'.
**Д)** 'злаваць, выклікаць злосць'.